ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫ

Орган гаркому КП(б)Б, гарсавету і гарпрафсавету.

№ 138 | СУБОТА, 17 чэрвеня 1933 г. | № 138

АБ АРГАНІЗАЦЫІ НАГЛЯДУ АБ ВІДАХ НА ЎРАДЖАЙНАСЬЦЬ.

Пастанова аб'яднанага пасяджэньня бюро гаркому КП(б)Б і прэзыдыуму гарадзкога савету ад 5 чэрвеня 1933 г.

Надаючы вялізарнае значэньне правільнаму вызначэньню ўраджайнасьці, маючае выключна важнае значэньне ў складаньні і выкананьні народна-гаспадарчага пляну, прэзыдыум гарсавету і бюро гаркому КП(б)Б пастанаўляюць:

1. Прапанаваць упаўнаважаным гаркому, сэкратарам сельпарт'ячэек, старшыням сельсаветаў, агрэпэрсапалу тэрмінова правесьці масава-растлумачальную працу сярод калгаснікаў, рабочых саўгасаў аб тым вялізарным значэньні, якое мае дача правільных зьвестак аб відах на ўраджай і фактычную ўраджайнасьць.

2. ГарЗА на працягу 2-х дзён накіраваць бляпкі і формы па вядзеньні вучоту ўраджайнасьці ў сельсаветы з падрабязнай інструкцыяй, як запаўняць іх.

3. Вынаджаючым таварышам у сельсавет, як па лініі гаркому, так і гарсавету, на месцы інструктаваць сельсаветы, завастраць увагу сельсаветаў вакол гэтага пытаньня і праверыць як рыхтуюцца сельсаветы да дачы першых зьвестак па становішчы на 15 чэрвеня.

4. Склікаць агранараду, на якой паставіць пытаньне аб правядзеньні гэтай працы.

5. На чарговым пленуме гарсавету абгаварыць пытаньне аб вучоце ўраджайнасьці.

6. Прапанаваць газэце «Віцебскі пралетар» шырока асьвятліць у друку значэньне правядзеньня работы па азначэньні ўраджайнасьці.

7. Тав. Паўленка вылучыць адказнага за збіраньне матар'ялу па азначэньні ўраджайнасьці.

Сэкратар гаркому КП(б)Б Міцько
Старшыня гарсавету Кардашэнка

Злачынна-марудныя тэмпы сяўбы ў нашым раёне кладуць ганебную пляму на ўсю БССР.

РАШУЧА ЛІКВІДАВАЦЬ УСЯЛЯКІЯ ПРАЯВЫ АПАРТУНІСТЫЧНАГА САМАЦЁКУ І ДЭКЛЯРАЦЫЙНАСЬЦІ, ПОЎНАСЬЦЮ ЎЛІЧЫЦЬ КРЫТЫКУ ПАМЫЛАК І ПАКАЗАНЬНІ тт. ГІКАЛО І ГАЛАДЗЕДА І ЦО „ЗЬВЯЗДА", БЕЗАДКЛАДНА ЗАВЯРШЫЦЬ СЯЎБУ, РАЗГАРНУЦЬ ВОРЫВА ПАПАРУ, ПРАПОЛКУ І ПАДРЫХТОЎКУ ДА ЎБОРКІ.

ЗАВЯРШЫЦЬ СЯЎБУ, НАГНАЦЬ ПРАПУШЧАНАЕ.

На 14 чэрвеня плян веснавой сяўбы па Віцебшчыне выкананы на 90,7 проц. У той час як калгасы ў асноўным выканалі пасеўны плян, па аднаасобным сэктары плян выкананы толькі на 70,4 проц., па каапгасах—88,2 і саўгасах—86,8 проц.

Злачынна-марудныя тэмпы сяўбы ў нашым раёне тармозяць і зрываюць выкананьне агульна-рэспубліканскага пляну, ставяць БССР ззаду ў спаборніцтве з Заходняй вобласьцю. Гэтым самым наш раён, як вусім правільна адзначае ЦО „Зьвязда", кладзе ганебную пляму на ўсю рэспубліку.

Невыкананьне дырэктывы т. т. ГІКАЛО і ГАЛАДЗЕДА, нагледаючаеся нават зьніжэньне тэмпаў сяўбы ў апошнія пяцідзёнкі сьведчаць, што кіраўніцтва раёну (сэкратар гаркому т. МІЦЬКОЎ, старшыня гарсавету т КАРДАШЭНКА) не забясьпечыла самага дзейснага, жалезнага бальшавіцкага кантролю над выкананьнем тых пастаноў і дырэктыў, якія вынесены і зроблены гаркомам партыі і гарсаветам у апошні час. З боку гаркому і гарсавету не забясьпечаны штодзённы і самы пільны нагляд і кіраўніцтва за работай упаўнаважаных, сельсаветаў, ячэек. Яркі прыклад гэтаму—„дзейнасьць" упаўнаважанага па Старасельскім сельсавеце ЯСЬКОВА і брыгадзіраў АРЛОЎСКАГА і РУБІНТАЛЯ, першы з якіх склікае нарады замест апэрацыйнага кіраўніцтва сяўбой, а другія—займаюцца „очковтирательством". Уся гэтая „тройца" зрывае сяўбу ўпаўне свабодна і беспакарана. І такіх прыкладаў можна было-б прывесьці яшчэ шмат.

Пралетарскі Гомель выслаў нашаму раёну дапамогу спэцыяльную буксірную брыгаду ў складзе лепшых прадстаўнікоў партаганізацыі. Буксірная брыгада, працуючы непасрэдна на месцах (Рудніцкі і Рудакоўскі сельсаветы, каапгасы) аказвае вялізарнейшую дапамогу ў ліквідацыі прарыву па сяўбе, перадаючы вопыт Гомельшчыны ў правядзеньні пасеўнай кампаніі, прымаючы самы непасрэдны ўдзел у рабоце.

На вялікі жаль, ні гарком, ні гарсавет і ні газэта „Віцебскі пралетар" ня прынялі належных захадаў да таго, каб памножыць вопыт работы Гомельшчыны і яе буксірнай брыгады, каб на самым факце буксіру мабілізаваць усе сілы нашай партарганізацыі, усіх рабочых саўгасаў і каапгасаў, калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў, а галоўнае, перабудаваць сваю работу, практыку яе на неадкладнае завяршэньне сяўбы ў раёне.

Далейшае адставаньне, хаця б на адзін дзень, ня можа быць інакш кваліфікавана, як простае супраціўленьне партыі і ўраду, як просты сабатаж веснавой сяўбы з боку кіруючых органаў. Бязумоўна, што такое становішча нецярпіма і партыя ня будзе цацкацца з тымі людзьмі, якія злосна зрываюць ажыцьцяўленьне гаспадарча палітычных мерапрыемстваў.

Тэлеграма тт. Гікало і Галадзеда—гэты выключны па сваёй палітычнай важнасьці партыйны дакумант, крытыка „Зьвяздой" памылак кіруючых органаў Віцебшчыны і рэакцыі «Віцебскага пралетара» павінны былі-б ужо даўно прымусіць і гарком, і гарсавет, і рэдакцыю прыняць сапраўдныя меры для выпраўленьня памылак, пакончыць з адставаньнем і завяршыць сяўбу. Але факты сьведчаць аб іншым і ўпаўне заслужонай зьяўляецца тая крытыка ДАЛЕЙШАГА ПРАЦЯГВАНЬНЯ І ПАГЛЫБЛЕНЬНЯ ПАМЫЛАК, якая даецца „Зьвяздой" у перадрукоўваемым намі сёньня яе перадавым артыкуле.

Малейшае самазаспакаеньне—губіць справу. Патрэбна высачэйшая мабільнасьць, патрэбна самая жорсткая і прытым рашучая, практычная барацьба з апартуністычным самацёкам і людзьмі, параджаючымі яго.

Сяўба павінна быць скончана безадкладна, яравыя павінны быць засеяны да аднаго гектара. Неабходна дабіцца безагаворачнага і поўнага выкананьня пляну сяўбы па аднаасобным сэктары. Гэта задача можа і павінна быць вырашана пры бязьлітаснай барацьбе з кулацкім сабатажам, з носьбітамі яго як зьне, так і ўнутры нашых уласных радоў, у нашых партыйных і савецкіх органах.

Асобна аб каапгасах. Каапгасы адсталі надзвычай ад калгасаў. Гэтае адставаньне, гэты ганебны зрыў сяўбы па каапгасах, як мы ўжо адзначалі ў перадавым артыкуле ад 16 чэрвеня, зьяўляецца простым вынікам агідных саноўна барскіх адносін гарпрафсавету, на чале са старшыней яго т. КРЫМКЕВІЧАМ, да сяўбы ў каапгасах. «Як-жа,—лічаць гэтыя людзі,—мы будзем займацца такімі пытаньнямі». Для іх, бач, прыгатаваны стравы «высокай палітыкі», а гэта іх не датычыцца. Толькі тупыя, самазадаволеныя чыноўнікі могуць так работаць.

Сяўба ў каапгасах павінна быць неадкладна завершана. Забясьпечыць гэта—адзін з першых абавязкаў кіраўніцтва гарпрафсавету, па выкананьні якога траба мерваць аб яго здольнасьці змагацца за палепшэньне матар'яльна-бытавых умоў рабочай клясы.

Але ад нас сёньня патрабуецца ня толькі скончыць сяўбу. Прапушчанае павінна быць нагнана своечасовым і высокакласным скончэньнем праполкі і ворыва папару, ударнай падрыхтоўкай да ўборачнай кампаніі. Між тым, як сыгналізавала наша газэта ў ранейшых нумарох, праполка, ворыва папару і падрыхтоўка да ўборкі таксама ПУШЧАНЫ НА САМАЦЁК. ЧЫНУШЫ І БЮРАКРАТЫ З КІРАЎНІЦТВА ГАРСАВЕТУ І ГАРЗЕМАДДЗЕЛУ СВАЁЙ БЯЗЬДЗЕЙНАСЬЦЮ ЗРЫВАЮЦЬ ГЭТЫЯ КАМПАНІІ.

Траба сёньня з усёй рашучасьцю заявіць, што кіраўніцтва гарсавету аказалася ня толькі нездольным забясьпечыць практычнае кіраўніцтва сяўбой, але нікольні НЯ ЎЛІЧЫЛА ЎРОКАЎ І ПАМЫЛАК У ЧАСЕ СЯЎБЫ. Праполка, ворыва папару і падрыхтоўка да ўборкі—ПАД НАГРОЗАЙ ЗРЫВУ. Мы патрабуем ад гарадзкога камітэту партыі прыняцьця самых рашучых і жорсткіх мер у адносінах кіраўніцтва гарсавету і гарЗА, самых дзейсных мерапрыемстваў для забясьпячэньня праполкі, ворыва папару і падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі.

УЗНАЧАЛІЦЬ РАЗГОРТВАНЬНЕ ПАПАРАВАЙ І ПРАПОЛАЧНАЙ КАМПАНІЙ.

МАШКАНЫ, 16. (Па тэлефоне).

Плян сяўбы па Машканскім сельсавеце да 15 чэрвеня выкананы. Засеяна 2151,96 га пры пляне ў 2120 га. Калгасы засеялі 1352,39 га (плян 1288 га), аднаасобнікі засеялі 516,45 га (плян 510)

Учора, 15 чэрвеня, быў праведзены пленум сельсавету сумесна з актывам, на якім падагулілі вынікі сяўбы. Пленум прайшоў пад знакам крытыкі і самакрытыкі, выкрываньня зробленых памылак у часе сяўбы. Пленум і актыў распрацоўваюць заклік замастоцкіх калгаснікаў і рад канкрэтных мерапрыемстваў па правядзеньні праполачнай кампаніі, уздыме папару і падрыхтоўцы да ўборачнай кампаніі.

На сёньняшні дзень праполка і ўздым папару ідзе незадавальняюча. Сельсавет яшчэ ня мае зьвестак аб ходзе ўздыму папару і праполкі. Гэта сьведчыць, што сельсавет і парт'ячэйка не арганізавалі апэрацыйнага кіраўніцтва праполачнай і папаравай кампаніяй.

Усяго па сельсавеце павінна быць узьнята 849 га, калгасным сэктары 767 га і па аднаасобным—82 га папару. Перадавыя калгасы распачалі ўчора ўздым папару і праполку. Калгас „Чырвоны Кастрычнік" узараў 2,5 га. Брыгады Шылава і Люцкага з калгасу імя Сталіна пачалі 15 чэрвеня ўздым папару і праполку збожжавых.

На пленуме сельсавету, у адказ замастоцкім калгаснікам, машканцы ўзялі на сябе абавязак да 22 чэрвеня скончыць ворыва папару і праполку. Улічваючы памылкі веснавой сяўбы, разьбіваючы кулацкі сабатаж, сельсавет і партячэйка павінны неадкладна і па-бальшавіцку ўзначаліць ход работ, каб забясьпечыць выкананьне дырэктыў партыі і ўраду, а таксама свайго ўласнага абавязацельства. Зэлікон.

ГНІЛЫЯ ЛІБЭРАЛЫ ЗРЫВАЮЦЬ СЯЎБУ Ў ДОЎЖЫ.

ДОЎЖА, 16. (Па тэлефоне).

Сельсавет усё яшчэ не ліквідаваў ганебнага адставаньня ў сяўбе і працягвае праваль-ваць выкананьне штодзённых заданьняў. Учора, 15 чэрвеня, сельсавет даў толькі 1,5 проц. прыросту пляну. Гэта лічба лішні раз даказвае, што сельсавет і парт'ячэйка не перабудаваліся на завяршэньне звышударнымі тэмпамі сяўбы і аднячасовае разгортваньне ворыва папару, праполкі і падрыхтоўкі да ўборкі.

Сэкратар парт'ячэйкі Гарадзецкі лібэральнічае са зрыўшчыкамі сяўбы, як старшынёй калгасу «Новы шлях» Багданавым, апошні яшчэ да сёньняшняга дня не забясьпечыў выкананьне пляну, ашукаўшы парт'ячэйку іллывымі абяцаньнямі, што сёньня-заўтра скончыць сяўбу. Старшыня калгасу «камуніст» Багданаў наўмысьля адцягвае завяршэньне сяўбы, бо не жадае аказаць дапамогі калгасам «Сілач» і «Інтэрнацыянал».

Толькі адзін калгас „Шлях Ільліча» (старшыня Багданаў Д.) выканаў плян сяўбы. Калгасы «Сілач» і «Інтэрнацыянал» на сёньняшні дзень выканалі плян на 80 проц. Учора яны далі мізэрны прырост выкананьня пляну.

Хопіць міндальнічаць з кулацкімі агентамі Гнілыя лібэралы з Доўжы павінны, нарэшце, атрымаць па заслугах. Казанскі.

Аб пад'ёме папараў і арганізацыі ўборкі збожжавых па паўночных раёнах.

Пастанова Савету Народных Камісараў Саюзу ССР і Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б)

У дадатак да пастановы СНК СССР і ЦК УсеКП(б) „Аб пад'ёме папараў і арганізацыі ўборкі збожжавых" ад 24 мая 1933 году ўстанавіць наступны мінімальны плян пад'ёму чыстых папараў пад азімыя і яравыя культуры па паўночных раёнах (у тыс. гектараў):

Краі і вобласьці	Усяго па ўсіх сэктарах	Калгасы	У тым ліку: З іх калгасы, абсл. МТС	Аднаасобнікі	Саўгасы ўсіх сыст.	З іх: Наркамсаўгас.	Наркамзем
Ленінградзкая	407,0	236,0	55,0	169,1	1,9	0,1	0,4
Заходн. вобл	700,0	510,0	143,0	177,0	13,0	5,9	3,4
Маскоўская вобл.	880,0	695,0	150,0	150,0	35,0	11,2	9,7
Горкаўскі край	2119,0	1150,0	250,0	960,0	9,0	2,5	4,2
Паўночны край	211,0	180,0	14,0	6[illegible],0	1,0	—	0,3
Іванаўск. вобл.	493,0	332,0	100,0	150,0	11,0	7,4	8,2
БССР	399,0	200,0	9[illegible],0	190,0	9,0	6,2	2,5
Башкірыя	1048,0	7[illegible]5,0	310,0	180,0	133,0	126,4	4,0
Татарыя	1006,0	800,0	360,0	180,0	26,0	15,0	7,4
Уральск. вобл.	1773,0	1400,0	690,0	100,0	273,0	255,2	10,0
Сярэдняя Волга	2223,0	1540,0	980,0	200,0	483,0	439,2	38,4
Казакская АССР	905,0	717,0	400,0	6,0	182,0	169,1	2,2
Заходн. Сібір	2011,0	1453,0	788,0	100,0	458,0	421,6	3,4
Усходн. Сібір	872,0	610,0	327,0	135,0	127,0	120,7	2,6

Абавязаць мясцовыя партыйныя і савецкія органы, Наркамзем і Наркамсаўгасаў скончыць падняцьцё папараў не пазьней: 25 чэрвеня—па Маскоўскай вобласьці, Ленінградзкай вобласьці, Татарыі, Горкаўскім краі, 1 ліпеня—Іванаўскай вобласьці, Заходняй вобласьці, БССР, Сярэдняй Волзе; 10 ліпеня—Башкірыі і Паўночным краі; 20 ліпеня—Заходняй Сібіры, Казакстане; 1 жніўня—Уральскай вобласьці; 10 жніўня—Усходняй Сібіры.

Устанавіць тэрмін засавіцы збожжавых калясавых па ўсіх калгасах і саўгасах паўночных раёнаў—17—20 дзён.

Абавязаць партыйныя і савецкія арганізацыі Ленінградзкай вобласьці, Маскоўскай вобласьці, Заходняй вобласьці, Іванаўскай вобласьці, Татарыі, Паўночнага краю, Горкаўскага краю і БССР забясьпечыць вязку ў снапы ўсяго хлеба; Уральскай вобласьці, Сярэдняй Волзе, Башкірыі, Заходняй Сібіры, Усходняй Сібіры, Казакстану—ня менш 2/3 усяго хлеба.

Абавязаць партыйныя і савецкія органы, НКЗем адабраць і перарыхтаваць да ўборкі па калгасным сэктары:

ВОБЛАСЬЦІ.	Камбайнараў.	Штурвальных.	Ільнопераробільшчыкаў.	Машыністаў на складан. малатарцы.	Работнікаў на спопаванні
Ленінградзкая	—	—	1720	700	30
Заходняя вобласьць	—	—	2830	600	40
Маскоўская вобласьць	—	—	1240	990	90
Горкаўскі край	—	—	1270	685	150
Паўночны край	—	—	300	50	10
Іванаўская вобласьць	—	—	2000	845	40
БССР	—	—	1300	1400	200
Башкірыя	290	290	—	600	200
Татарыя	270	270	—	880	50
Уральская вобласьць	2000	2000	1270	2000	650
Сярэдняя Волга	1900	1900	—	3600	800
Казакская АССР	1100	1100	—	1500	800
Заходняя Сібір	2300	2300	650	4000	900
Усходняя Сібір	60	60	45	1260	160

Старшыня Савету народных камісараў Саюзу ССР *В. Молатаў (Скрабін)*

Сэкратар ЦК УсеКП(б) *І. Сталін.*

14 чэрвеня 1933 году.

Не марудзіць далей ні аднэй мінуты.

З перадавога артыкулу „Зьвязды".

91,9 і 92,2.

Лічбы гавораць самі за сябе. ЗАХОДНЯЯ ВОБЛАСЬЦЬ, з якой спаборнічае БССР, НАС АБАГНАЛА.

Наша рэспубліка разгарнула сяўбу значна раней, чым Зах. вобласьць, прыкладна на 10—12 дзён. Увесь час да чэрвеня мы ішлі ў авангардзе па сяўбе яравых. Зах. вобласьць адставала ў сярэднім на 30—25 проц.

Тым больш ганебнымі зьяўляюцца для нас вынікі сяўбы па рэспубліцы на 10 чэрвеня.

БССР засеяла толькі 2461717 гектараў, або 91,9 проц пляну

А Заходняя вобласьць—3134400 га—92,2 проц. І гэта ў той час, калі яшчэ ў мінулую пяцідзёнку мы мелі большыя паказальнікі.

Заходняя вобласьць упэўнена заваёўвае першынства ў спаборніцтве з нашай рэспублікай.

Вазьмеце такую асноўную культуру, як лён. Яшчэ ў шостай пяцідзёнцы мая мы ішлі на першым месцы па сяўбе ільну. У нашых руках былі ўсе магчымасьці значна раней, чым Зах. вобласьць, і дэтэрмінова выканаць плян.

А што вышла?

Зах. вобласьць па-бальшавіцку перамагла адставаньне і першай—яшчэ 5 чэрвеня—рапартавала ЦК УсеКП(б)—тав. Сталіну і СНК СССР аб поўным выкананьні пляну па сяўбе ільну. І гэта пры заданьні ў два разы большым, чым у нас!

А мы нават і да 10 чэрвеня ня здолелі поўнасьцю засеяць лён. Усе тэрміны ганебна сарваны. Засеяна толькі 254577 гектараў—97,9 проц. пляну. Такое-ж становішча і па іншых культурах, за выключэньнем збожжавых (104,2 проц. пляну).

ЦК КП(б)Б і СНК БССР у сваёй тэлеграме адстаючым раёнам з усёй сілай выкрылі прычыны нашага адставаньня ў сяўбе. Цэнтральны Камітэт і Саўнарком своечасова зрабілі гэтым раёнам апошнее папераджаньне і абавязалі іх поўнасьцю скончыць сяўбу максымум да 5 чэрвеня. Указаньніў, што і як трэба было рабіць, як перамагчы адставаньне і поўнасьцю за апошні, вызначаны ЦК і СНК тэрмін, засеяць яравыя—адстаючыя раёны атрымалі больш, чым даводзі.

Далёка, аднак, ня ўсюды, далёка ня ўсе кіраўнікі адстаючых раёнаў па-бальшавіцку ўлічылі папярэджаньне ЦК КП(б)Б і СНК БССР.

Наадварот, у цэлым радзе месц людзі абмежаваліся фармальным прызнаньнем памылак, бюракратычнай славесна-дэкларацыйнай адпіскай з алілюйскімі абяцаньнямі скончыць сяўбу.

Па сутнасьці ў радзе раёнаў мы маем просты сабатаж дырэктыў ЦК і СНК, колькі-б кіраўнікі гэтых раёнаў ні кляліся ў сваёй гатоўнасьці выконваць указаньні Цэнтральнага Камітэту і Саўнаркому.

Так і толькі так трэба ацэньваць работу кіраўніцтва такіх раёнаў, як ВІЦЕБСКІ, ГАРАДОЦКІ, СІРОЦІНСКІ, БЕШАНКОВІЦКІ і г. д.

Што зрабіла, напрыклад, віцебскае кіраўніцтва ў адказ на катэгарычную дырэктыву ЦК і СНК пакончыць з адставаньнем і поўнасьцю завяршыць сяўбу да 5 чэрвеня?

На словах, у рэзалюцыях—шмат. На справе, па сутнасьці—НІЧОГА. Тая ж работа пастарынцы, панска-саноўнымі, славесна-дэкларацыйнымі мэтадамі.

Чаго варта тое, што ў Віцебску людзям, выключаным з партыі за зрыў сяўбы, па-ранейшаму даручаюць... кіраваць пасеўнай. У папярэдніх нумарох «Зьвязды» мы адзначылі ўжо, скромна кажучы, своеасаблівасьць віцебскіх «выпадкаў», калі людзі, выключаныя з партыі, заставаліся... на чале парт'ячэек.

Віцебскі гарком абмежаваўся фармальнай адпіскай, дэкларацыйным прызнаньнем дапушчаных памылак. Далей рэзалюцый справа не пайшла.

Ня дзіва, што раён выканаў плян сяўбы яравых толькі на 80,9 проц Дзіўна толькі чаму мясцовая газэта «ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫ» знаходзіць магчымым пры такіх ганебных паказальніках заяўляць, што ў раёне «ужыты рашучыя захады, мабілізаваны ўсе сілы і сродкі на завяршэньне сяўбы і г. д.»

Стараньне, вартае лепшага выкарыстаньня. Відаць, крытыка памылак віцебскага кіраўніцтва і самой газэты прайшла бясьсьледна толькі для гаркому, але і для яго органа.

Каму патрэбна гэта шкодная алілюйшчына, гэта апартуністычнае заспакаеньне? Наколькі трэба страціць пільнасьць, каб ня бачыць праўднага становішча з веснавой сяўбой у раёне.

Рэвалюцыйная пільнасьць, бальшавіцкая непрымірнасьць у барацьбе за лінію партыі, жалезную дысцыпліну і выразнае выкананьне дырэктыў нашай партыі—вось, што патрабуецца ад кожнага камуніста.

Урокі веснавой сяўбы настойліва яшчэ раз падкрэсьліваюць неабходнасьць рашуча ўзмацніць рэвалюцыйную класавую пільнасьць, узмацніць барацьбу з штампоўшчынай і алілюйшчынай, са славесна-дэкларацыйнасьцю, гніла-лібэральнымі адчосінамі да ты хто скажае і сабатуе дырэктывы партыі і ўраду.

Жалезны бальшавіцкі адпор найменшым дэмабілізацыйным настроям, спаўцы на самацёк апартуністычнаму заспакаеньню!

Віцебскі, Сіроцінскі, Гарадоцкі і іншыя адстаючыя раёны сваімі злачынна-марудныя тэмпамі сяўбы кладуць ганебную пляму на ўсю рэспубліку, тармозяць і зрываюць выкананьне рэспубліканскага пляну, ставяць на зваду Заходняй вобласьці.

Кіраўнікі гэтых раёнаў, відавочна, яшчэ цяпер не зразумелі, што партыя не пацерпіць ніякіх адтэрміновак, што партыя будзе нязмірна выкрываць кожнага, хто на словах клянецца ў вернасьці лініі партыі, а на справе сабатуе, ня выконвае яе дырэктыў.

Адстаючыя раёны абавязаны ня толькі неадкладна і поўнасьцю да аднаго гектара засеяць яравыя, але і па-бальшавіцку нагнаць прапушчаны час своечасовым і высокакласным скончэньнем праполкі і ворыва папараў і ўдарнай падрыхтоўкі да ўборкі ўраджаю.

Нарады і „очковтирательство"—замест ударнай работы.

СТАРАЕ СЯЛО, 16. (Па тэлефоне).

За 15 чэрвеня засеяна калгасамі Старасельскага сельсавету 10,8 га ільну. Калгас «Новае жыцьцё» засеяў 5,57 га, калгас „Свабода" засеяў 1 га, «Камунар»—1,23 га, «1 мая»—3 га.

Зусім адстае аднаасобны сэктар, які за 15 чэрвеня засеяў усяго 10 га ільну. Атрыманае в гораду ільнонасеньне на 16 чэрвеня знаходзіцца яшчэ ў сельСТ. Колькі патрэбна было калгасам апошнія атрымалі, але-ж аднаасобнікі яшчэ да гэтага часу ня ўсё атрымалі.

Прырост выкананьня пляну за апошнія дні зусім нязначны. Гэта тлумачыцца тым, што ўпаўнаважаны гаркому партыі Яськоў замест апэрацыйнай работы на мясцох займаецца штодзённымі нарадамі.

Брыгадзіры в гораду, як Арлоўскі і Рубінталь, замест мабілізацыі мас на хутчэйшае выкананьне пасеўнага пляну, займаюцца «очковтирательством».

Арлоўскі быў прымацаваны да аднаасобнага Касьцюкоўскага пункту. Некалькі дзён таму назад ён паведаміў сельсавет, што гэты пункт цалкам скончыў свой плян, а калі дэталёва праверылі, то аказалася, што недасеяна 11,5 га.

Рубінталь быў прымацаваны да Волатаўскага пункту і таксама даў перавялічаныя зьвесткі.

Грынман.

Разгортваецца ворыва папару і праполка.

Калгас „Чырвоны ўсход", Міхалёўскага сельсавету, пачаў праполку гародаў і баранованьне бульбы. На праполцы гародаў працавалі 8 жанчын, і 3 кані на баранованьні бульбы.

У калгасе таксама прыступілі да ворыва папару. Калгас пачаў рыхтаваць хлявы, дзе будзе захоўвацца збожжа. Брыгада № 3 пасьля заканчэньня сяўбы пераключылася на масавую праполку канаў для асушкі сенажацяй. Калгаснікі на концы канаў перавыконваюць норму на 40 проц.

В. Шрубін.

ЧЫСТКА І ПРАВЕРКА РАДОЎ ПАРТЫІ.

Кожны бальшавік павінен быць у аванґардзе барацьбы за ажыцьцяўленьне гаспадарчых плянаў.

ЕАБХОДНЫ ПРАЦЭС АЧЫШЧЭНЬНЯ ЗДАРОВАГА АРГАНІЗМУ.

Ужо чацьвёрты дзень як у памяшканьні одзкай сталоўкі праходзіць чыстка партыйх радоў ячэйкі скурзаводу. Перад тварам тісіі з лепшых стойкіх і адданых партыі льшавікоў, якім яна даверыла правяраць е рады, і перад усёй масай беспартыйных ючых за гэтыя дні прайшлі праверку тры сткі камуністаў.

Старшыня праверкому тав. Пятроў пя ка, каб перад адчыненьнем кожнага сходу і працэсе ўсёй работы па чыстцы, не сказаць, о «наша работа павінна праходзіць у дзела- і таварыскай абстаноўцы, пад знакам разгорнай крытыкі і самакрытыкі. Раскажы, як льшавік, шчыра, адчынена, адчуваў, што ты асяродзьдзі сваіх таварышоў па рабоце». І праўды, у гэткай дзелавой і таварыскай таноўцы праходзіць чыстка партыі.

Калі аналізуем жыцьцяпіс, работу ўсіх тут айшоўшых чыстку камуністаў, здаецца, што ад табой вось зараз прайшоў дзесятак год рацьбы і работы ўсяго заводу ў цэлым.

Праходзіць праверку сын рабочага, рабочы-муніст тав. Любімцаў. Ён зусім яшчэ мала- , яму ўсяго толькі 32 гады. Але Любімцаў йшоў нямалы этап рэвалюцыйнай барацьбы, франтох грамадзянскай вайны і сацыялічнай будоўлі.

У 1917—19 гадох Любімцаў у Астрахані вяактыўную барацьбу супроць контррэвалюйных сіл. Потым самакатчыкам на фронце бярэжжа Касьпійскага мора супроць банд нікіна, Мамантава, Бачэрахава і інш. Прыдзелі ў наступленьні пад Варшавай. У 20 годзе пападае ў плен, дзе вядзе масавую оту сярод пленных. У 1921 годзе зварочецца ў СССР і зноў паступае добраахвотна ў ны Чырвонай арміі.

Толькі пасьля дэмабілізацыі, у 1924 годзе, бімцаў прыходзіць на завод на пасаду змазка. Завод для Любімцава становіцца неадлучі часткай яго жыцьця і побыту. Яго веоць на заводзе як лепшага ўдарніка, энтуеста вытворчасьці, лепшага вынаходцу; выконьніцтва і прапановы Любімцава далі заво за 1932 год 17000 рублёў эканоміі.

Цяпер няма на заводзе Любімцава змазчыка ёсьць Любімцаў—мэханік заводу. Ён—лепшы н парты і рабочае клясы, герой пяцігодкі.

Галоўны недахоп у рабоце ячэйкі ў тым, о яна недаацаніла палітычнай сутнасьці барацьбы за падняцьцё ідэйна-палітычнага ўзроўню, за марксыцка-ленінскае выхаваньне членаў і кандыдатаў партыі. Многія з прайшоўх чыстку камуністаў элемэнтарна палітычнапісьменны. Частка з іх ня ведае нават таковажнейшага гістарычнага дакумента партыі, рашэньні студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б), асноўных палажэньняў статуту і грамы партыі. Пры чыстцы партыйцы бер, Рубінштэйн, Лукін, Остры і інш. здолелі нічога сказаць аб палітыцы партыі ў цянальным пытаньні, аб задачах другой пігодкі, аб правых і „левых“ апартуністах.

І ў гэтым, у палітычнай пісьменнасьці, яюцца карэньні вялікай клясавай пільнасьці ногіх партыйцаў скурзаводу. Гэты прабел у боце партыйнай ячэйкі паказаў сабе ў час стцы з выключнай яскравасьцю. З-за адсутсьці гэтай пільнасьці ў рады партыі праньлі чуждыя, клясава-варожыя нам элементы, дыры, п'яніцы, дэзарганізатары вытворчасьці, лаеў і Назараў.

Хто такі Назараў? Гэта—адзін з актыўйшых бандытаў у мінулым, які ў 1924 годзе ёк з-пад варты і хаваўся да 1929 году ў радзе гарадоў Самару пад прозьвішчам Мядзьведзёў і клічкай „Назарчык“.

Назараў доўга не прызнаецца Калі старшыня камісіі тав. Пятроў задаў яму пытаньне: «ці ведаеш ты нейкіх Мядзьведзёва і Назарчыка», ён доўга не адказвае. І толькі калі з-за пытаньняў выкручвацца стала немагчыма, Назараў прызнаецца: «гэта—я».

Як бачыце, гэты агент клясавага ворага здолеў пралезьці на завод, атрануцца ў рабочую блюзу і атрымаць партыйны білет, каб больш замаскавана праводзіць антысавецкую «работу». Назараў у цэху адчынена не алважыцца выступіць, бо ён ведае, што яму дадуць належны адпор,—ён дзейнічае „ціхай сапай“, «хныканьнем», выкарыстоўваючы часовыя труднасьці росту сацыялістычнага будаўніцтва, скалачвае вакол сябе прыхільнікаў, накшталт Штукмэйсьцера і інш.

Назараў—гэта адзін з тых, аб кім т. Сталін гаварыў:

„Будучы вышыбленымі з калёіны і расьвідаўшыся па ўсім СССР, гэтыя былыя людзі распаўзьліся па нашых заводах і фабрыках, па нашых установах і гандлёвых арганізацыях, па прадпрыемствах чыгуначнага і воднага транспарту і, галоўным чынам, па калгасах і саўгасах. Распаўзьліся і схаваліся яны там, накінуўшы маску „рабочых“ і «селян», пры чым сёй-той з іх пралез нават у партыю“.

Ячэйка на бачыла, што сабой уяўляе партыец Штукмэйсьцер, які адчынена выступіў на сходзе па чыстцы з антыпартыйнымі наскокамі, ня бачыла і сутнасьці Пасфальскага—лодыра і сымулянта, дэзарганізатара вытворчасьці, ня ведала, што Вашвілаў—п'яніца і разлажыўшыйся элемэнт, не плаціўшы 2 гады партыйных узносаў. Вось гэтыя людзі, ніводна ня маючыя агульнага з нашай партыяй, мелі партыйныя білеты ў кішэні і зьяўляліся прамымі дапаможнікамі Назарава.

Праверка партыйнай ячэйкі скурзаводу яшчэ раз паказала і пацьвердзіла правільнасьць і своечасовасьць рашэньня партыі аб чыстцы іменна ў гэты пэрыяд, калі партыя і ўся рабочая кляса ўступілі ў такі адказнейшы пэрыяд барацьбы за пабудову бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва

Сапраўдныя бальшавікі, адданыя партыі, беспартыйныя рабочыя ў адказ на пастанову партыі яшчэ вышэй узнімуць тэмпы барацьбы на ўсіх франтох сацыялістычнага будаўніцтва. Гэта паказваюць ужо першыя дні чысткі на скурзаводзе. Калі 8 чэрвеня на заводзе быў выканан прамфінплян на 78 проц., дык 10 чэрвеня—у дзень чысткі—ён выканан на 91 проц і 11-га—на 118,5 проц Брыгады камуністаў Міхельсона і Бураўкіна выконваюць заданьне: першая—на 153 проц, другая —на 158 проц., брыгада беспартыйнай ударніцы Рашылавай—на 124 проц. Сам т. Міхельсон выканаў за апошнюю пяцідзёнку сваё заданьне на 183 проц., Бураўкін—на 191 проц., беспартыйныя рабочыя: Варашылаў — на 176 проц., Тхорэва—на 147 проц, Мажэяў —на 112 проц.

Праверыўшы і ачысьціўшы свае рады ад усіх чуждых, разлажыўшыхся, прымазаўшыхся і выпадкова папаўшых у іх людзей, якія зьяўляюцца прамымі агентамі клясавага ворага, партыйная ячэйка скурзаводу будзе ў перадавых радох барацьбы за выкананьне прамфінплану, за яго колькасныя і якасныя паказчыкі, за генэральную лінію партыі. Завод быў і павінен быць у калёне перадавых прадпрыемстваў Віцебску.

Д. Пецярэнка

Правяраюцца па справах сваіх.

Партгрупа зьмены „Д“ вязальнага цэху фабрыкі імя Клары Цэткін, члены якой 13 чэрвеня праходзілі чыстку, дзякуючы ўвязваньню падрыхтоўкі да чысткі з гаспадарча-палітычнымі задачамі, стаячымі перад цэхам, прыйшла з наступным дасягненьнем: прамфінплян за 10 дзён чэрвеня выканан на 102,2 проц., штопка замест 21 проц. па пляне складае 20,9 проц, штопка-брак замест 2,82 проц. па пляне складае 0,98 проц.

— Сур'ёзную ўвагу ў маёй рабоце я зьвярнула на тое,—гаворыць Баравіцкая,—каб у цэху ня было навалена і брудна. Заўсёды я сачу за работай той альбо іншай работніцы альбо машыны; прымячаючы, што на асобных вучастках цэху маецца прарыў, я зварачаю туды больш увагі, перакідваю сілы на «вузкае» месца і гэтым своечасова ліквідую прарыў.

Партгрупорг т. Скрагаи, якая мае за сваімі плячыма 29 год рабочага стажу, расказвае сходу як партгрупа ажыцьцяўляе сваё кіраўніцтва камуністамі і ўсімі рабочымі, працуючымі на гэтай зьмене.

Надрэнна яна адказвае на тыя палітычныя пытаньні, якія даюцца ёй камісіяй. Ведаюць яе ўсе работніцы як прыкладную, перавыконваючую свае заданьні і вядучую за сабой астатнюю беспартыйную масу, дзякуючы аўтарытэту якой зьмена дабілася перамог у выкананьні прамфінпляну.

Крыху хвалюючыся, падыходзіць да стала выхаваная ў гэтым цэху работніца тав. Бранзбург —зараз высунутая інструктарам фабзавуча. На фабрыцы т. Бранзбург працуе з 1923 г., у 1926 годзе ўступіла ў камсамол і ў 1928 г. у партыю. Прабываньне ў камсамоле выхавала з яе добрую работніцу на вытворчасьці—яна адна з першых перайшла на работу на 4 насадачных машыны.

— Зьяўляючыся добрай работніцай і інструктарам, тав. Бранзбург, аднак, не зьвярнула ўвагі на сваё палітычнае выхаваньне,—робіць заўвагу старшыня камісіі тав. Прудзікаў, на што тав. Бранзбург запэўнівае камісію, што яна прыме ўсе меры да таго, каб сябе падказаць марксыцка-ленінскай тэорыяй.

Супроць дегласьцю гэтым зьяўляецца Карэйша.

Выхадзец з дробна буржуазнай сям'і, яна не парвала з ідэалёгіяй сваёй клясы, выпадкова пападае ў партыю з за шкурных інтарэсаў—жаданьня паехаць куды-небудзь вучыцца, альбо ўстроіцца «ў цёплае мястэчка». Прамфінплян Карэйша ня выконвае, але на чыстцы прыкідваецца, што ня ведала аб гэтым. Калі адной-чы патрэбна было перакінуць яе на другую машыну—больш важную ў той час, чым тая, дзе яна працавала раней, Карэйша адмовілася гэта выканаць.

На запытаньне ці стойкі яна член партыі, яна сама адказвае: «Не, ня стойкі».

— Ці ёсьць клясавая барацьба зараз у нас і з кім мы вядзем клясавую барацьбу?—на гэтае запытаньне Карэйша адказаць ня можа. Яна ня чытае газэт і ня выконвае ніякай нагрузкі.

— Ня варта яна насіць званьня члена ленінскай партыі,—выказваюцца ў спрэчках пасобныя таварышы.

На сходзе прымячаецца значнае павышэньне актыўнасьці работніц. Аб кожным партыйцы выказваюцца, характарызуючы яго як з дрэннага боку, так і з добрага

Брыгада «В. П.»:
Лур'е, Наўмоўскі, Эйштэйн.

ЗА ГРАНІЦАЙ.

ПРАМОВА, ЯКАЯ БЫЛА ПАКРЫТА АПЛЁДЫСМЭНТАМІ.

Выступленьне т. Літвінава на сусьветнай эканамічнай канфэрэнцыі.

ЛЁНДАН. На пасяджэньні сусьветнай эканамічнай канфэрэнцыі 14 чэрвеня пасьля амэрыканскага міністра замежных спраў Хэла пры напружанай увазе перапоўненай залі выступіў тав. Літвінаў, сустрэчаны аплёдысмэнтамі.

Па меры таго, як т. Літвінаў разьвіваў свае палажэньні, увага аўдыторыі з мінуты на мінуту расла. Прамова т. Літвінава, якая зьмяшчала канкрэтныя, рэальныя, пазбаўленыя ўсякіх лішніх слоў, прапановы, рэзка вылучалася на фоне выказаных тут прамоў, перапоўненых агульнымі фразамі. Прамова была пакрыта працяглымі аплёдысмэнтамі.

Водгукі і выказваньні карэспандэнтаў буржуазных газэт характарызуюць прамову т. Літвінава, як «адну з цікавейшых прамоў» на канфэрэнцыі.

Карэспандэнт францускай газэты „Тан“ гаворыць як аб станоўчым зьявішчы аб выпрацоўцы франка савецкай эканамічнай згоды. Карэспандэнты амэрыканскіх газэт паведамляюць: «прапановы па закупках на 1 млрд. даляраў утварыла ўражаньне на амэрыканскіх і брытанскіх дэлегатаў. Наглядальнікі згаджаюцца з Літвінавым у тым, што савецкі рынак лёгка мог бы пагінуць большую частку сусьветных лішкаў, калі быў-бы наладжан доўгатэрміновы крэдыт“. Адзін з карэспандэнтаў падкрэсьлівае, што «ні прамова Чэмбэрлена, ні прамова Хэла не ўсхвалявалі канфэрэнцыю» і што хвалюючае ўражаньне на канфэрэнцыі зрабіла тое месца прамовы Літвінава, у якім дэлегатам маляваліся рэальная магчымасьць гандлёвых зьдзелак. Рад карэспандэнтаў германскіх газэт у сваіх карэспандэнцыях аб выступленьні т. Літвінава асабліва застанаўліваюцца на разгорнутай т. Літвінавым пэрспэктыве аграмадных савецкіх заказаў.

Лёнданскі цьвёрдалобы друк спрабуе замаўчаць выступленьне т. Літвінава на міжнароднай эканамічнай канфэрэнцыі, зьмяшчаючы толькі невялікія паведамленьні аб ёй, скажаючы ў пасобных выпадках гэтае выступленьне. Так, адна з цьвёрдалобых газэт пускаецца на яўны падлог, заяўляючы быццам савецкая заява аб гатоўнасьці вытварыць імпартныя закупкі датыкаецца 200 млн. даляраў, а не 1 млрд., як на самай справе сказаў т. Літвінаў.

Прамова тав. Літвінава поўнасьцю будзе надрукавана ў наступным нумары газэты.

ВІЦЕБСКІ ДЗЕНЬ.

✱ Новы дом адпачынку на 400 асоб адчыняецца ў Лужасьне для рабочых фабрыкі „КІМ“ і імя К. Цэткін.

✱ 14 лепшых фізкультурнікаў гораду з'явярнуліся гэтымі днямі з усебеларускага сьвята, прысьвечанага 10-гадоваму юбілею фізкультурным арганізацыям Беларусі. Усе гэтыя таварышы прынялі актыўны ўдзел у сьвяце і спаборніцтве па гімнастыцы, падняцьці цяжараў, боксу і інш. Віцебская каманда заняла першае месца па Беларусі па гімнастыцы і трэцяе месца па падняцьці цяжараў, боксу і барацьбе

✱ Аддзяленьне па выпрадоўцы восьпеннага дэтрыту адчыняецца з 1 ліпеня пры санбакінстытуце. Восьпеннае аддзяленьне будзе зьяўляцца першым у Беларусі, якое забясьпечыць дэтрытам усе гарады і раёны рэспублікі. Кошт будаўніцтва—15 тыс руб.

— 13400 асоб прайшло за чатыры месяцы праз вэтзоомузэй. Музэй наведала 248 экскурсій.

МЕСЯЧНІК ЧЫСТАТЫ.

✱ За 3-ю пяцідзёнку месячніка чыстаты зроблена 551 санагляд у па горадзе. Сюды ўваходзяць 468 двароў, 13 вуліц, 9 рабочых інтэрнатаў і розныя ўстановы гораду.

✱ 536 асоб прайшло праз лазьні і стрыжку за 3-ю пяцідзёнку месячніка. Адначасова вытварана санапрацоўка інтэрнатаў саўпартшколы і падінстытуту.

✱ Свалачнае месца для адкідаў і сьмецьця ўстанавіў гаркамгас у 3-м раёне па Полацкай шашы.

✱ У 2-м раёне гораду вытвараны рамонт і санапрацоўка 4-х крам, калгаснай гардэбатні, рэстарану і сталовай ІТР.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ.

17, 18 і 19 чэрвеня ад 6 да 10 г. увечары ў Доме камасьветы будзе праводзіцца КАНСУЛЬТАЦЫЯ-СЭМІНАР ДЛЯ ТРЫКУТНІКАЎ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ І КІРУЮЧАГА ПАРТАКТЫВУ на тэму: „Тактыка партыі ў 1905—1917 гг.“.

20 чэрвеня, а 6-й гадзіне ўвечары на гэтую ж тэму адбудзецца канфэрэнцыя, на якую павінны зьявіцца трыкутнікі прадпрыемстваў і кіруючы партактыў.

Культпроп ГК КП(б)Б.

19 чэрвеня, а 6 гадзіне, увечары ў памяшканьні гарсавету, пакой № 44, адбудзецца ПЛЕНУМ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАЙ СЭКЦЫІ.

З ПОШТЫ „ВІЦЕБСКАГА ПРАЛЕТАРА“.

Палац працы, 3-ці паверх.

ЖОРСТКА СУДЗІЦЬ САМАПРАЎЦУ МІСУНОВА.

(Ліст калгасьнікаў).

На вечарынку ў вёсцы Шчарбакі, Міхалёўскага сельсавету, зьявіўся п'яным старшыня ЗЬСТ Місуноў. У гэты час у доме. дзе адбывалася вечарынка, з вуліцы нехта выбіў акно. Місуноў выхваціў наган і, накіраваўшы яго на публіку, патрабаваў выдаць выбіўшага акно, пагражаючы што калі апошні ня будзе выданы, ён заб'е нявіноўных.

Праз некаторы час Місунову прыйшла думка зрабіць у прысутнічаючых вобыск аружжа. Выходзіць на адзіночку“,—скамандаваў ён, калі-ж прысутнічаўшы на вечарынцы Пашкевіч Язьма не пажадаў падпарадкавацца самапраўцы, Місуноў схапіў Пашкевіча за грудзь, выцягнуў яго за дзьвер і выстраліў у яго з нагана. Толькі дзякуючы таму, што Пашкевіч не расьцягаўся і ўпаў на зямлю, куля прайшла міма

«Пахаджэньні» Місунова на гэтым ня спыніліся. Вышаўшы на двор і абзываючы сабраўшыхся на вечарынцы бандытамі, ён пагражаў, што перастраляць. Даўшы на разьвітаньне некалькі выстрадаў, Місуноў скрыўся.

Семяненка Іван,
Семяненка Якаў,
Каралькоў Ляксандр,
Пашкевіч Кузьма,
Мікіценка Восіп.

АД РЭДАКЦЫІ. Мы патрабуем ад пракуратуры безадкладнай высылкі на месца сьледчага і арганізацыі паказальнага працэсу над самапраўцай.

Выгнаць кулацкага сынка!

(Ліст калгасьніка).

З калгасу «Дырыжабль», Рудакоўскага сельсавету, быў выключаны прабраўшыйся было ў калгас кулак Буракоў Іван Ніканаў, раскорны асуджаны за контррэвалюцыйную агітацыю. Сына ж яго Ігната чамусьці пакінулі ў калгасе і нават прызначылі ў калгасе брыгадзірам.

Варта ўвагі тое, што сам старшыня сельсавету т. Кэрбель падтрымлівае з гэтым кулацкім сынком шчыльную сувязь. У лютым гэтага году Буракоў Ігнат спраўляў хрэсьбіны і запрасіў да сябе «ганаровымі гасьцямі» старшыню сельсавету Кэрбеля і старшыню калгасу «Дырыжабль» Гаўрылава.

Я лічу, што кулацкі сын, наш клясавы вораг, ня толькі ня можа і не павінен быць брыгадзірам, але наогул яму ня можа быць месца ў калгасе.

Самухін.

АД РЭДАКЦЫІ.

Рэдакцыя лічыць патрабаваньне тав. Самухіна зусім правільным. Буракоў Ігнат, сын высланага кулака, агітаўшага за разбурэньне калгасу, бязумоўна ніводнай гадзіны ня можа застацца ў калгасе. Інакш, як стратай клясавай пільнасьці і буржуазным перараджэнствам нельга назваць тое, што старшыня сельсавету тав. Кэрбель і старшыня калгасу „Дырыжабль“ тав. Гаўрылаў пакрываюць кулака і высоўваюць яго на адказную пасаду брыгадзіра, чым даюць яму магчымасьць больш шкодзіць нам.

Мы патрабуем выключэньня з калгасу кулака Буракова Ігната, а паводзінамі Кэрбеля і Гаўрылава павінна заняцца гарКК.

Вартаўнік, бязумоўна, у адказе.

(Ліст калгасьніка).

У калгасе «Чырвоны двор», Мікалаёўскага сельсавету, амбар, дзе хаваецца калгаснае насеньне, ахоўвае вартаўнік Маскалёў Алесь. Нядаўна ў амбары разламалі падмурак і пакралі адтуль насеньне, а вартаўнік Маскалёў нічога «ня чуў і ня бачыў».

Трэба прыцягнуць Маскалёва да адказнасьці.

Дрэвін.

АД РЭДАКЦЫІ. Што тут: службовая нядбайнасьць альбо кулацкае злачынства? На гэта мы чакаем адказу ад праўленьня калгасу, з адначасовым паведамленьнем аб прынятых мерах.

Злачынна перавыдаткоўваюць сыравіну.

(Ліст рабочых).

На фанэрным заводзе злачынна адносяцца да сыравіны Так, для шпона сярэдзіны патрэбны разьмер даўжыні чурака ў 134 см, а рэжуць чуракі, якія згатаўляюцца для верхняга шпону і даўжыня якіх мае 163 см. Значыцца, лішковая даўжыня 33 см ад кожнага чурака адыходзіць у сьмяцьцё. Такіх чуракоў у сярэднім варштат прапускае 170 штук у зьмену, а ў суткі ўсяго 6 варштата-зьмен.

Трэба спыніць такія злачынныя адносіны да скарыстаньня сыравіны.

Голад, Юватаў, Пілоскі.

АД РЭДАКЦЫІ. Тав. Мальчык павінен неадкладна рэагаваць на паказанае ў лісьце зьявішча. Чакаем яго паведамленьня.

Забясьпечыць лепшыя ўмовы.

(Ліст вучняў ФЗВ).

Школа ФЗВ мэталістаў накіравала ў каапгас імя Молатава на 5 дзён 40 вучняў для работы па сяўбе. Дырэкцыя каапгасу зусім не забясьпечыла нармальных умоў для прадукцыйнай работы вучняў. Памяшканьне, дзе начуюць вучні, халоднае. Сьнеданьне падаюць вучням вельмі дрэннае (капуста без хлеба).

Трэба, каб дырэкцыя каапгасу зараз-жа склала патрэбныя ўмовы для прадукцыйнай работы вучняў і паленпыла іх харчаваньне.

Калінін, Кузьняцоў, Іофэ.

З аваднём не змагаюцца.

(Ліст селькора).

Праца па барацьбе з падскуранымі аваднём па Віцебскім сельсавеце пушчана на самацёк. Вэтурач калгасу імя Чарвякова т. Марчанка яшчэ не пачаў працу па барацьбе з гэтым шкоднікам жывёлы, нягледзячы на неаднаразовыя напаміны аб гэтым. Марчанка разважае: «некалі хадзіць па вёскам, мне і так хапае, а к таму і ніякія ўрачы па Віцебскаму сельсавету не прыступілі да гэтай працы».

Буткевіч.

АД РЭДАКЦЫІ. Чакаем па сутнасьці гэтага ліста паведамленьня ад тав. Храпуновіча.

СЁНЬНЯ, А 7 ГАДЗІНЕ ЎВЕЧАРЫ. У ПАМЯШКАНЬНІ ГАРСАВЕТУ, пакой 28,
СКЛІКАЕЦЦА НАРАДА
СТАРШЫНЬ КАМСОДАЎ усіх фабрык, заводаў і ўстаноў сумесна з членамі фінсэкцыі гарсавету ПА ВЕЛЬМІ ВАЖНЫМ ПЫТАНЬНІ. Яўка абавязкова.
537—2—2

Усім школам, больніцам, дзіячым садам, ясьлям і ўстановам, якія НЕ АТРЫМАЛІ 60 ПРОЦ. ДРОЎ ГАДАВОЙ НОРМЫ на атопны сэзон 1933—34 году,
атрымаць іх да 20 чэрвеня.
Неатрымаўшым да паказанага тэрміну
дровы адпускацца ня будуць.
Усім ЗРК і ЦРК тэрмінова зьявіцца за атрыманьнем вызначанай ім гарпрафсаветам і гартопам колькасьці ордэраў.
536—2—2 ГАРТОП.

Віцебскае аддзяленьне Белдзяржкіно даводзіць да ведама, што усе выданыя пропускі на права ўваходу ў кіно і тэатры, з 18 ЧЭРВЕНЯ АНУЛЮЮЦЦА і па іх прапускаць у кіно ня будуць.
530—3—3

Віцебскі рабфак пры Ленінградзкім электратэхнічным інстытуце „сувязі, абвяшчае АСЕНЬНІ НАБОР студэнтаў на 1, 2 і 3 курсы (вячэрнія) без адрыву ад вытворчасьці і на 4-ты курс (дзённы) з адрывам ад вытворчасьці.
Умовы прыёму згодна даведніка Наркамасьветы для паступаючых на рабфакі.
Прыём заяў з усімі дакумантамі вытвараецца ў канцаляры рабфаку—Віцебск, Валадарская, 58|15, штодзённа з 9 гадз. раніцы да 3 гадз. дня і з 6 да 9 гадз. увечары.
Прыймовыя іспыты з 1 па 5 верасьня.
Заняткі пачнуцца з 7 верасьня.
541—3—1

Лічыць несапраўднымі згубленыя і пакрадзеныя партдакуманты:
на імя т.т. Завацкага Станіслава Пятровіча (п. б. № 0803602), Ульмішэк Давіда Абрамавіча (п. б. № 2723733), Хапінскага Іосіфа Барысавіча (п. б. № 1301804), Пятніцкага Віктара Алекс. (п. б. № 0804140), Фейгэльман С. Л. (п. б. № 1625794), Усмана Шаі Шмуйлава (п. б № 1103647), Воранава Кірэя Фёдарава (п. б. 1620746) і Ізофілава Сяргея Арцемавіча (п. б. № 2723495).
Таксама лічыць несапраўднымі партбілеты выключаных з партыі і няздаўшых іх—В галава Васіля Іванавіча (п. б. № 1620771) і Сіляева Мікалая Васільлевіча (кандыдацкая картка № 1623).
539—1—1

Віцебскі завод стандартных дамоў № 4 паведамляе, што маюцца
АПОЛКІ І ПАДАПОЛАЧНЫЯ ДОШКІ,
якія могуць быць адпушчаны ў любой колькасьці розным арганізацыям і калгасам.
Зварочвацца па адрасе: В.-Грамадзянская, 6 тэлеф. 7-68.
540—3—1

Швэйная фабрыка „Прафінтэрн“ прапануе ўсім былым рабочым і служачым, а таксама працуючым зараз на фабрыцы, ЯКІЯ ДА ГЭТАГА ЧАСУ НЕ АТРЫМАЛІ АБЛІГАЦЫІ ПАЗЫКІ „4. ЗАВЯРШАЛЬНЫ ГОД ПЯЦІГОДКІ“, ДА 18 ЧЭРВЕНЯ г. г. ЗЬЯВІЦЦА Ў РАЗЬЛІКОВУЮ КАНТОРУ ДЛЯ АТРЫМАНЬНЯ СВАІХ АБЛІГАЦЫЙ. Пасьля паказанага тэрміну аблігацыі будуць зданы ў ашчадкасу на абязьлічанае хаваньне.
518 3—3

Рэдакцыі «Віцебскага пралетара» патрэбны
ЛІТАРАТУРНЫЯ ПРАЦАЎНІКІ.
З прапановамі зьвяртацца ў сэкратарыят рэдакцыі: Палац працы, 3 паверх, пакой 43, тэлефон 1—73.

Усім былым і цяперашным працаўнікам Віцебскага лесапрамгасу, якія не атрымалі аблігацый пазыкі «Чацьвёртага, завяршаючага», прапануецца атрымаць гэтыя аблігацыі да і ліпеня.
Пасьля паказанага тэрміну, аблігацыі будуць перададзены ў абязьлічаным выглядзе ў Віцебскую ашчадкасу.
505—4—4

АДЧЫНЕН АСЕНЬНІ НАБОР У ФЗВ МЭТАЛІСТАЎ.
Прымаюцца вучні на базе 7-годкі 1916, 1917, 1918 гг. нараджэньня па спэцыяльнасьцях—СЬЛЮСАРЫ, КАВАЛІ, ЛІЦЕЙШЧЫКІ, ФАРМАЎЦЫ, ТОКАРЫ. Пры паступленьні патрэбны наступныя дакуманты: 1) мэтрычны выпіс, 2) даведка аб сацыяльным паходжаньні, 3) аб адукацыі.
Заявы прымаюцца ў памяшканьні ФЗВ —вул. Мэталістаў, 12 ад 10 да 4 гадз. дню.
Прынятыя вучні забясьпечваюцца стыпэндыяй, інтэрнатам і сталоўкай, 1-шы сьпіс нараўне з рабочымі заводу.
532—2—2

Адчынен асеньні набор у ФЗВ швэйнікаў.
Прымаюцца вучні на базе 5, 6, 7 груп 1917, 1916 і 1915 г. г. нараджэньня.
НАБОР 300 ЧАЛ.
Пры паступленьні патрэбны наступныя дакуманты: 1) мэтрычны выпіс, 2) даведка аб сацыяльным паходжаньні. 3) аб адукацыі.
Заявы прымаюцца ў памяшканьні ФЗВ (Базэрная вул., № 10, ад 9-ці да 5-ці гадз. дню. Прыём заяў з 1-га чэрвеня па 15 жніўня.
Прынятыя вучні забясьпечваюцца стыпэндыяй, інтэрнатам і сталоўкай. Пачатак заняткаў 1-га верасьня г. г.
ДЫРЭКЦЫЯ.
479—5—5

Згубленую круглую пячатку з надпісам «рабочы каапгаратыў заводаў „Чырвоны мэталіст“ і „Камінтэрн“—лічыць несапраўднай.
543—1—1

Згубленую круглую пячатку школы-камуны Імя Крупскай лічыць несапраўднай.
542—1—1

Прадаецца ДОМ
з двума вольнымі пакоямі і садам, 2-я Валадарская, 52.
507—3—1

Друкарня „Камінтэрн“, Бальшавіцкая, 10.